# «Сваю перамогу прысвячаю бацькам»

**Арганізатары 11-га Нацыянальнага конкурсу прыгажосці не раз адзначалі, што дзяўчаты сёлета падабраліся выдатныя: яркія, актыўныя, усебакова развітыя і адукаваныя, мэтанакіраваныя і самастойныя, у той жа час далікатныя, сціплыя, дысцыплінаваныя і зусім не капрызныя. Знаёмячыся крыху бліжэй з новай «Міс Беларусь» Марыяй Васілевіч, заўважаеш усе гэтыя якасці і пакрысе разумееш, чаму менавіта яна аказалася першай сярод больш як 700 прэтэндэнтак і 30 фіналістак конкурсу.**


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Настройвалася на перамогу, бо толькі ў гэтым выпадку чалавек раскрывае ўсе свае магчымасці, задзейнічае ўсе рэсурсы для дасягнення мэты, так што я старалася быць на ўсёй красе, але такі зыход падзей усё адно стаў нечаканасцю, — прызналася «Міс Беларусь» пасля фіналу шоу. — Вядома, гэта неперадавальная эйфарыя, усплёск эмоцый, якія цяжка апісаць словамі! Хачу падзякаваць перш за ўсё бацькам, родным і сябрам за падтрымку — яны заўжды былі і застаюцца маёй галоўнай апорай. Тое, што я сёння знаходжуся на гэтай сцэне, таксама шмат у чым іх заслуга, і перамогу я прысвячаю менавіта ім.

...Першая прыгажуня краіны — мінчанка, без пяці хвілін выпускніца Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. Таму ў яе планах — не толькі з годнасцю выконваць абавязкі «Міс Беларусь» і рыхтавацца прадставіць нашу краіну на міжнародным конкурсе «Міс свету» сёлета ў снежні, але і ўдзельнічаць у дабрачынных і іншых сацыяльна значных мерапрыемствах, а таксама дапісаць і абараніць дыплом і, па магчымасці, прадоўжыць атрыманне адукацыі ў аспірантуры.

Узыходжанне Марыі Васілевіч на конкурсны Алімп — зусім не гісторыя Папялушкі, у тым сэнсе, што дзяўчына не чакала цудаў ад хроснай феі, а цвяроза ацэньвала свае магчымасці. Напрыклад, мы з вамі маглі ўбачыць дзяўчыну на конкурсе яшчэ два гады таму, калі знаёмыя параілі ёй паспрабаваць сябе на кастынгу. «Але я адчувала, што ў 18 гадоў яшчэ не гатовая, перадусім маральна, да такога складанага выпрабавання, і пакуль варта засяродзіцца на вучобе, — тлумачыць прыгажуня. — А вось летась, прыкладна за некалькі тыдняў да пачатку кастынгаў, зразумела, што хачу паспрабаваць свае сілы і гатовая выкласціся на сто працэнтаў. Прыйшла з сяброўкай — на жаль, яна не прайшла на конкурс, але я ўпэўнена і шчыра жадаю, каб у яе ўсё склалася паспяхова надалей». Як бачым, вера ў свае сілы, памножаная на карпатлівую штодзённую працу, гнуткасць і ў той жа час моц характару, прынеслі свой плён — карону «Міс Беларусь — 2018», грашовы прыз памерам у 500 базавых велічынь (каля 12 тысяч рублёў), ключы ад шыкоўнага пазадарожніка і вялікія перспектывы на будучыню.

Дарэчы, пра ключы. Як высветлілася, дзяўчына мае не толькі вадзіцельскае пасведчанне, але і вопыт пілатавання самалёта! «Гэта было мінулым летам, мы з сябрамі вырашылі пакатацца на лёгкаматорным самалёце. І тут пілот прапанаваў: хто самы смелы, можа паспрабаваць сябе ў якасці другога пілота — ну і я, відавочна, падняла руку. Ён растлумачыў самыя азы: што як трымаць, а што не чапаць увогуле, і мы разам паляталі. Ці не страшна было? Шчыра прызнацца, страшней сядзець на заднім крэсле, бо самалёт быў далёка не новы, і яго трэсла як след», — смяецца дзяўчына, успамінаючы гэты выпадак.

Яшчэ Марыя марыць стаць тэлевядучай. Тым больш, для гэтага ў яе ёсць і гучны тытул, і прывабная тэлегенічная знешнасць, а яшчэ і выдатнае веданне беларускай мовы, якую дзяўчына пяшчотна любіць.

— Калі арганізатар конкурсу, тэлеканал АНТ, проста заўтра прапануе — «ідзі, Маша, да нас вядучай», то якія праграмы хацелася б рабіць? — крыху правакуем дзяўчыну. Але галаваскружэнне ад поспеху — гэта не пра яе, і Марыя адказвае ўдумліва і сур'ёзна:

— Перадусім, натуральна, я пайшла б вучыцца на курсы тэлевядучых. Бо адной толькі мары мала: я да ўсіх сфер, за якія бяруся, стаўлюся адказана, і хочацца быць дасканалай у кожнай сферы. Так што першай прыступкай у кар'еры вядучай мусіць стаць прафесійная адукацыя.

А вось лагічнае і цікавае для многіх пытанне, ці свабоднае сэрца прыгажуні альбо варта пачынаць зайздросціць яе маладому чалавеку, пакуль што засталося без адказу. «Давайце патрымаем інтрыгу», — усміхаецца Марыя на нясціплыя роспыты і пацвярджае: так, яна памятае, што паводле кантракту з Нацыянальнай школай прыгажосці ёй на працягу двух гадоў нельга выходзіць замуж, і безумоўна выканае гэтую ўмову.

### Прыгажуні і тытулы

Акрамя кароны «Міс Беларусь», па традыцыі арганізатары і партнёры Нацыянальнага конкурсу прыгажосці адзначылі прызамі дзяўчат — пераможцаў у іншых намінацыях:

**Ксенія Вясельская** са Слаўгарада стала «Міс сяброўства» (яе ананімна выбіралі самі ўдзельніцы конкурсу), атрымаўшы ў якасці прыза грашовы сертыфікат і падарожжа па гарадах Еўропы.

Тытул «Міс Арыфлэйм» заваявала 22-гадовая мінчанка **Аліна Магер,** якой падарылі гадавы запас касметыкі і права стаць новым тварам брэнду.

Бабруйчанцы **Марыі Першай**, якая стала «Міс глядацкіх сімпатый» па выніках галасавання на сайце АНТ, падарылі сертыфікат на паслугі спа-цэнтра і пуцёўку ў Парыж.

«Міс топ-мадэль» — **Дзіяна Астапчык** з Гальшан і «Міс фота» — **Караліна Барысевіч** з Гродна змогуць правесці незапланаваны вакацыі — тыднёвы адпачынак у пяцізоркавым гатэлі ў Турцыі. «Міс фота» таксама падпішацца ролю ў сваім новым фільме рэжысёр Дзмітрый Астрахан.

Мінчанка **Анастасія Лаўрынчук,** якую журы выбрала «Другой віцэ-міс Беларусь», атрымала ў падарунак ювелірны выраб — залатую падвеску. А «Першая віцэ-міс Беларусь» **Маргарыта Мартынава** са Слоніма ў дадатак да залатых завушніц атрымала права прадставіць Беларусь на міжнародным конкурсе «Miss Supranational», які пройдзе ў Польшчы.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.20 | 20.53 | 15.33 |
| Віцебск — | 5.04 | 20.48 | 15.44 |
| Магілёў — | 5.10 | 20.43 | 15.33 |
| Гомель — | 5.13 | 20.34 | 15.21 |
| Гродна — | 5.36 | 21.08 | 15.32 |
| Брэст — | 5.43 | 21.02 | 15.19 |

## Месяц

*Апошняя квадра ў 5.09. Месяц у сузор'і Вадаліва.*

## Імяніны

**Пр.** *Марка, Сільвестра, Сяргея.*
**К.** *Лізы, Вікторa, Міхала, Пятра, Станіслава.*


Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

# ЗАЎТРА




**Наступны нумар газеты «Звязда» выйдзе ў чацвер, 10 мая.**

## Даты | Падзеі | Людзі

**8 МАЯ**




**1883** год — нарадзіўся (в. Данілаўка, цяпер у Светлагорскім раёне) Сцяпан Мікалаевіч Некрашэвіч, беларускі мовазнавец, акадэмік НАН Беларусі (1928 год). Распрацаваў тэарэтычныя асновы і прынцыпы стварэння дыялекталагічных слоўнікаў беларускай мовы. Аўтар прац па праблемах беларускага правапісу, распрацоўваў навуковай тэрміналогіі. Апублікаваў больш за 30 навуковых прац, у тым ліку тры манаграфіі. У 1930-я гады рэпрэсаваны, у 1937 годзе прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1957 і 1988 гадах. Адноўлены ў званні акадэміка ў 1978 годзе.



**1943** год — нямецка-фашысцкі гарнізон у вёсцы Налібакі Стаўбцоўскага раёна (каля 250 чалавек) пасля артылерыйска-мінамётнага абстрэлу быў атакаваны і разгромлены партызанскімі атрадамі імя Дзяржынскага (камандзір К. Ф. Шашкін), імя Суворава (Ф. В. Суркоў) і «Бальшавік» (А. Я. Макееў) брыгады імя Сталіна. У выніку 2-гадзіннага бою партызаны знішчылі значную колькасць жывой сілы праціўніка, захапілі чатыры станковыя кулямёты, тры мінамёты, вялікую колькасць іншай зброі і боепрыпасаў, спалілі электрастанцыю, лесазавод, казарму і ўсе ўстановы акупантаў.




*8—9 мая — Дні памяці і прымірэння, прысвечаныя памяці ахвяр Другой сусветнай вайны. Абвешчаны па рашэнні 59-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН 22 лістапада 2004 года па ініцыятыве Расіі і краін СНД у сувязі з 60-годдзем заканчэння Другой сусветнай вайны, якое адзначалася ў 2005 годзе.*

**1828** год — нарадзіўся Анры Жан Дзюнан, швейцарскі грамадскі дзеяч, ініцыятар стварэння міжнароднага таварыства «Чырвоны Крыж» (1863 год), першы лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру (1901, разам з Фрэдэрыкам Пасі). Памёр у 1910 годзе.

**1965** год — Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР у азнаменаванне 20-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў сваім указам зацвердзіў палажэнне аб ганаровым званні «Горад-герой». У той жа дзень яно было прысвоена Маскве, Ленінграду, Кіеву, Адэсе, Севастопалю, Валгаграду, Брэсцкай крэпасці («Крэпасць-герой»).

Шаноўную каляжанку **Веранічку КАНЮТУ —** працаўнічку, прыгажуньку, разумніцу — шчыра віншуем з нараджэннем першынца!

Маленькаму — добрага апетыту і салодкіх сноў, бацькам, бабулям-дзядулям — здароўя, поспехаў у выхаванні і грошай на пару-тройку сястрычак!



**Звяздоўцы**

З прыгожай датай, з **90-годдзем,** шчыра віншуем **Аляксандра Дзмітрыевіча ДЗЯНІСАВА!** Зычым моцнага здароўя, бадзёрасці, дабра і дабрабыту!



**Сябры з шахматнага клуба «Гамбіт»**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1790.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 7 мая 2018 года.